УДК 316.46(075.8)

ПСИХОЛОГИЧЕСКИЙ АСПЕКТ ПОЛИТИЧЕСКОГО ЛИДЕРСТВА

Студ. Новосельцева А.Р., к. и. н., доц. Лученкова Е.С.
Витебский государственный технологический университет

Не об одном феномене не спорят так часто как о политической лидерстве.

Социальная психология, политическая психология, как и другие науки изучающие феномен политического лидерства, пытаются найти разгадку, почему массы людей подпадают под очарование той или иной личности, с которой они связывают решение собственных или государственных проблем.

Исследование феномена лидерства имеют богатые традиции. Психологи первоначально исследовали его с позиций разных теорий личности, которые наложили отпечаток, прежде всего на понимание личности лидера, различных его характеристик и качеств (мотивов потребностей, воли, эмоций, темперамента, здоровья, характера, «Я-концепции», самооценки и др.), позволяющих ему стать во главе организации, партии или государства. Также существенным оказался и их вклад в теорию лидерства с позиции осмысления на него психологии различных групп общества (малых и больших) и стихийного поведения людей.

Среди ранних теорий политического лидерства особое место занимают теории героев и теории черт. Исходя из этих теорий, лидер рассматривается через призму определенных психологических качеств, свойств и факторов. Белее поздними теориями считаются теории среды, которые фокусируют внимание на роли социального окружения, личностно-ситуационные теории, которые пытаются совместить качества лидера с конкретными особенностями окружения, полагая то и другое двумя частями единого процесса; теории взаимодействия – ожидания опираются на настроение лидера и тех, кто за ними идет, возникающие при их совместной деятельности, «гуманистические теории» апеллируют к внутренним потребностям лидера и ведомых, ставят лидерство в зависимости от степени самореализации всех участников этого процесса.

В настоящее время под политическим лидером обычно понимается ведущее лицо политического процесса, осуществляющие функции объединения и сплочения социальных сил, задающие направления деятельности государственными и общественными институтами, политическими движениями. Именно политические лидеры представляют собой идеальную модель изучения лидерского поведения: у них высокая мотивация лидерства, потребности в достижении цели.

УДК 882.6

АДЛЮСТРАВАННЕ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў ТВОРЧАСЦІ В. БЫКАВА

Студ. Шавура В., к.ф.н. Уткевіч В. І.
Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

Беларуская літаратура пра вайну не толькі засведчыла трагедыю народа і ўславіла яго подзвіг у выратаванні чалавецтва ад фашызму, але і даследавала прычыны сусветнай трагедыі. Ваенныя аповесці В. Быкава – гэта высокамастацкія творы, з якіх складаецца гераічны эпас пра Вялікую Айчынную вайну. У іх аўтар сцвярджае выпрабаваныя ў барацьбе з фашызмам

ідэйныя і маральныя якасці: вернасць адвечным народным каштоўнасцям, любоў да роднай зямлі, высокую годнасць чалавека-працаўніка і воіна.

«Жураўліны крык» – аповесць Васіля Быкава, выдадзеная ў 1959 г. Распавядае аб жыццёвых гісторыях шасці чырвонаармейцаў, якія апынуліся ў старожцы на чыгуначным пераездзе, разам змагаліся, сябравалі, спрачаліся, пакутвалі, разважалі і трагічна загінулі ў баях з салдатамі вермахту. «Абеліск» – гераічная аповесць, створаная ў 1971 годзе. Аповесць пабудавана па схеме «аповед у аповядзе» і ставіцца да кірунку гераічнай – адзін з асноўных персанажаў аповесці Алесь Мароз паступае сапраўды гераічна, не паспрабаваўшы выратавацца, бо для яго ў сітуацыі, якая склалася, іншага годнага выхаду проста не было, бо гэты ўчынак не суадносіўся з нейкімі адцягненымі правіламі паводзінаў, а наадварот – з яго разуменнем чалавечага і настаўніцкага доўгу. Герой В. Быкава, з яго небывала абвостраным пачуццём асабістай годнасці, сваёй нацыянальнай і агульначалавечай прыналежнасці, маральнай чысцінёй, ведаў цану не толькі ўласнага жыцця, але і такіх паняццяў як «абавязак», «неабходнасць», «самаахвярнасць», «сумленне». У яго індывідуальным характары падчас вайны выступілі рысы народныя і агульначалавечыя, у падкрэслена асабістых пачуццях і намерах адкрылася перспектыва будучыні ўсяго чалавецтва.

Аповесці беларускага пісьменніка, якія ў крытыцы атрымалі назву «франтавыя», так і будуюцца, каб паказаць, як у душах герояў з рознымі характарамі і лёсамі адбываецца складаная барацьба паміж прагай жыць і немагчымасцю захаваць жыццё, хіба толькі цаною здрады. Многія яго творы на ваенную тэму не толькі вострасюжэтныя, што дасягаецца выпрабаваннем моцнай выключнай асобы выключнымі абставінамі і сітуацыяй выбару, але і вострапалемічныя, як «У тумане», «Сотнікаў», «Пайсці і не вярнуцца».

Заслуга В. Быкава менавіта ў тым, што, узнаўляючы старонкі трагічнага мінулага, ён напаўняе сваю прозу сучасным і адначасова вечным – тым, што хвалюе сёння кожнага з нас, што павінна хваляваць, калі хочам жыць і не знікнуць у гэтым свеце.

УДК 811.161.3

ЛЕКСЕМЫ СА ЗНАЧЭННЕМ АДЗЕННЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ ФРАЗЕАЛОГІІ

Студ. Лігарова Н.С., ст. выкл. Лебедзева С.В.
Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

Фразеалагізаваныя структуры той ці іншай мовы адлюстроўваюць асаблівасці нацыянальнага менталітэту, характару ўсведамлення рэальнага свету носьбітамі менавіта гэтай мовы. Фразеалогія, як і народныя вераванні, увасобіла ў сябе ўяўленні нашых продкаў аб душы – абавязковай для чалавека, але асобнай ад яго энергетычнай субстанцыі. Згодна з такімі поглядамі, частка душы можа кандэнсавацца ў найбольш блізкіх прадметах, і ў першую чаргу – у адзенні. Традыцыйны касцюм – адзін з галоўных элементаў этнічнай культуры беларусаў. Лічыцца, што пасля мовы народны касцюм з'яўляецца важнейшай этнічнай прыкметай.

У склад фразеалагізмаў дастаткова шырока ўключаны назвы адзення. Фразеалогія ўвасобіла архаічныя ўяўленні, звязаныя з момантам з'яўлення дзіцяці на свет, – нарадзіўся ў сарочцы; часткі адзення сталі суадносіцца з тымі ці іншымі рысамі характару, паводзінаў: свая кашуля бліжэй да цела; свая сярмяжка не цяжка; як у адной кашулі хрышчаныя. Кашуля ў прыказках і прымаўках станавілася ўвасабленнем багацця, нажытага скарбу: гулі, гулі, аж няма кашулі; хто мае дочкі, той ходзіць без сарочкі; з сарочкі вывесці. Сярод адзення шырокай знакавасцю вылучаецца кажух. У значнай ступені сімвалізацыі кажуха спрыяла густая поўсць на ім, якая заканамерна актуалізавала ідэю багацця, імітацыйнае прыпадабненне гушчыні. Ідэю жан-